Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
"Мазырскі дзяржауны педагагічны універсітэт
імя І. П. Шамяшна"

# МІЖНАРОДНЫЯ ШАМЯКІНСКІЯ ЧЫТАННІ "ПіСьМЕННІК - АСОБА - ЧАС"




Репозиторий БарГУ

Мазыр
2009

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МАЗЫРСКІ ДЗЯРЖАУНЫ ПЕДАГАПЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ І. П. ШАМЯКІНА"

# М1ЖНАРОДНЫЯ
# ШАМЯКІНСКІЯ ЧЫТАННІ
# "ПІСЬМЕННІК - АСОБА - ЧАС"

Матэрыялы Міжнароднай
навукова-практычнай канферэнцыі,
г. Мазыр, 19-20 лютапада 2009 г.

Мазыр
2009

Репозиторий БарГУ

5. Пяткевіч, А. М. Сюжэт / А. М. Пяткевіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. - Мінск: БелСЭ, 1987. - Т. 5. - С. 209.
6. Бураўкін, Г. Як сасонка ў бары / Г. Бураўкін // Полымя. - 1968. - № 6. - С. 227-229.
7. Бічэль-Загнетава, Д. Даўняе сонца: лірыка / Д. Бічэль-Загнетава. - Мінск: Маст. літ., 1990.-398 с.
8. Иванисенко, В. Поэзия, жизнь, человек: о лирике / В. Иванисенко. - М.; Сов. писатель, 1962. - 227 с.

*Пучынская Г. М. (Баранавічы, Беларусь)*

## МАСТАЦКІ ПРЫЁМ «ПЛЫНЬ СВЯДОМАСЦІ» Ў ТВОРЧАСЦІ В. КАЗЬКО

Проза В. Казько адлюстроўвае адну з тэндэнцый развіцця сучаснай беларускай літаратуры - абагуленага, маральна-філасофскага асэнсавання рэчаіснасці, што стварае пэўныя цяжкасці ва ўспрыманні твораў пісьменніка, асабліва чытачамі, непадрыхтаванымі да высокай ступені мастацкай абагуленасці.

В. Казько - выдатны майстар прозы. Яго творы маюць тыповыя высокамастацкія адзнакі буйных жанравых форм: усебаковае даследаванне ўнутранага свету чалавека, яго сувязей з грамадствам і прыродай, сюжэтна-кампазіцыйную шматпланавасць, шматгеройнасць, падрабязнасць апісання. Пісьменнік максімальна рэалізуе магчымасці эпічнага жанру рэалістычна асэнсаваць жыццё ва ўсёй складанасці і паўнаце. Разам з тым творы В. Казько адметныя сваёй тэматыкай і мастацкай формай. Даследчыкі літаратуры падкрэсліваюць асабліва складаную паэтыку, заглыблены філасофскі змест яго прозы. Шматлікія творы пісьменніка выяўляюць не столькі падрабязнае і паслядоўнае апісанне знешніх падзей, колькі ўнутраных - хроніку свядомасці героя («Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага саду», «Высакосны год» і інш.). Падрабязнае апісанне ўнутранага дзеяння надае аповесцям і раманам канцэптуальны характар, у чымсьці нават набліжае іх да філасофскага трактата. Прырода і цывілізацыя, чалавек і гісторыя, эгаізм і самаадданасць людзям, забыццё душы і памяць - вось далека не поўны пералік маральных праблем, якія ў прозе В. Казько набываюць канцэптуальнае значэнне. Дзякуючы ўскладненай паэтыцы, паглыбленай ідэйна-мастацкай аснове, творы пісьменніка адносяцца да так званай «інтэлектуалізаванай прозы», характэрныя рысы якой - «міфалагізацыя, рэтраспектыўны аналіз, элементы прыпавесці і парабалы, "расшчапленне" мастацкага часу, "плынь свядомасці"» [1, с. 729].

Паступова В. Казько ўсё больш уважліва ставіцца да свядомасці і падсвядомасці сваіх герояў. У апошніх творах (аповесці «Прахожы», рамане «Бунт незапатрабаванага праху» і інш. [2], [3]) назіраецца павышаная роля ўнутраных маналогаў, асацыятыўны аповед, часавыя напластаванні, глыбокі суб'ектывізм аўтарскай думкі, яе суцэльнасць і абрывістасць. Такія адзнакі характарызуюць школу «плыні свядомасці» [4]. У літаратуразнаўстве «плынь свядомасці» разглядаецца як жанравая форма (раман «плыні свядомасці», класічным узорам якога лічыцца «Уліс» Дж. Джойса) або як асобны мастацкі прыём [4].

У творчасці В. Казько «плынь свядомасці» выкарыстоўваецца як мастацкі прыём. Ён праяўляецца ў наступных асаблівасцях, якія характарызуюць прозу В. Казько:

— цякучасць, дыялектычная супярэчлівасць у выяўленні быцця. Крытыкі адзначаюць адметнасць і вастрыню, з якой пісьменнік ставіць складаныя пытанні. Свядомасць Прахожага, героя аднайменнай аповесці, фіксуе праблемы глабальнай значнасці. Ён лічыць, што чалавек - гэта «ахвяра і кат», «пагубіцель і выратавальнік» адначасова. Душа галоўнага героя двоіцца: з аднаго боку, чалавек - стваральнік, адказны за лес чалавецтва, які хоча выратаваць зямлю, бо мае гістарычную памяць, з другога - гэта «ненажэрная» істота, здольная забрудзіць увесь Сусвет.

Неймаверная ўскладненасць, заблытанасць маральна-этычных пытанняў, адсутнасць адназначнага на іх адказу праглядаецца ў аснове фактычна ўсіх твораў В. Казько. Жыццё герояў вымяраецца адчуваннем цяжару быцця, унутранымі перажываннямі, ваганнямі, успамінамі, думкамі, здольнымі ахапіць «учора», «сёння», «заўтра»;

— уважлівае стаўленне да свядомасці і падсвядомасці героя, якое ў аповесцях і раманах абумоўлівае пранікненне аўтарскай думкі ў нетры чалавечай душы. Семантычнае ядро аповесці «Прахожы» складаюць унутраныя маналогі, лірычныя разважанні Прахожага -

Рэпазітарый БарДУ

абстрагаванага персанажа, «старонняга назіральніка на вечным балі жыцця». Напружаная думка героя як бы «плыве» ў часе, таму аўтарская пазіцыя вызначаецца не па аб'ектыўных учынках (фабульным дзеянні), а па «плыні свядомасці» героя;

— высокая ступень суб'ектыўнасці, якая дасягаецца аўтабіяграфізмам твораў, іх асацыятыўнасцю, ірацыянальнасцю аўтарскага аповеду. Менавіта суб'ектывізм пры чытанні прозы В. Казько стварае ўражанне, што многае ў яго творах незразумелае, цяжкае для ўспрымання. С. С. Харужы ў артыкуле «Як чытаць "Уліса"» адзначае, што «...элемент незразумеласці ў рамане свядома прадугледжаны ў ім: гэта- частка стасункаў чытача з раманам, па задуме аўтара. Так гэтую незразумеласць і варта прыняць» [4, с. 622]. Думаецца, што чытачам прозы В. Казько таксама «варта прыняць» мастацкую ўскладненасць, высокую ступень суб'ектыўнасці твораў пісьменніка як унутраную якасць тэксту, абумоўленую імкненнем аўтара канцэптуальна, глыбока, усебакова асэнсаваць жыццё;

— пераменлівыя слаі рэальнасці. В. Казько эксперыментуе з мастацкім хранатогіам. Так, напрыклад, структура рамана «Хроніка дзетдомаўскага саду» ўскладнена напластаваннем месца і часу дзеяння - рэвалюцыя і грамадзянская вайна, час калектывізацыі і рэгірэсій, другая сусветная вайна, пасляваенная разруха, васьмідзесятыя гады; гістарычная і дагістарычная (міфалагічная) мінуўшчына, «аўтарскі час». Аналагічная будова характэрна і іншым творам, у якіх пісьменнік вольна распараджаецца прасторавымі і часавымі вымярэннямі.

У аповесці «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» дзеянне разгортваецца на'Палессі, але дзякуючы іншасказальнасці, аднамерная мастацкая прастора ўспрымаецца як ірэальны, фантасмагарычны свет, у якім дамінуе абсурд.

Аповесць «Прахожы» мае два прасторава-часавыя вымярэнні: на зямлі і камеце. Назямлі час «плыве», ён замаруджаны, але ў тых месцах, дзе ашчэваецца канец свету,- напружаны і драматызаваны. Часавае вымярэнне на зямлі неаднароднае: час бласлаўлёны (дзіш і спакой сусвету) і жахлівы, дзе правіць баль д'ябал. Яшчэ больш складана вызначыць прасторава-часавае вымярэнне на камеце, у касмічнай цемры, «дзе не было нічога», толькі прастора і час «скручваліся ў тугі скрутак і згаралі...» Чым больш звужаецца прастора і час на камеце, тым бліжэй яна да зямлі. Вызначэнне аўтарскай канцэпцыі часу і прасторы ў аповесці «Прахожы» і іншых творах дазваляе прыйсці да глыбокіх абагульненняў: тое, што можа пагубіць зямлю, «пракавечнае» зло, па-за прасторай і часам;

— адсутнасць строгай зададзенасці ў развіцці сюжэта, арыентацыя на эксперымент, фарматворчасць, умоўнасць пісьма. Як відаць на прыкладзе аповесці «Прахожы», рамана «Бунт незапатрабаванага праху», стыль В. Казько развіваецца ў напрамку разбурэння звыклага для чытача ўстойлівага сюжэта. Разам з тым складаная, яркая, наватарская паэтыка твораў зпітавана аўтарскай думкай у адзінае мастацкае цэлае. Нягледзячы на знешнюю «эмацыйную перагрэтасць», «перагружанасць метафорыкай, публіцыстычнай і фантасмагарычнай фактурай» [ 1, с. 747], кожная дэталь, мастацкі прыём у творах В. Казько строга прадуманы. Фрагментарна-асацыятыўны прынцып кампазіцыі, адсутнасць дакладна пабудаванай лініі, знешняя няўстойлівасць сюжэта ўласцівы аповесці «Прахожы». Твор складаецца з роздумаў аўтара над магчымай небяспекай з Космасу ў выглядзе каметы, якая пагражае сутыкнуцца з Зямлёй. Касмічныя рэаліі даюць магчымасць герою-апавядальніку задумацца над прызначэннем чалавечай цывілізацыі: на дабро ці зло яна створана?

Такім чынам, стыль В. Казько развіваецца ў напрамку паглыблення суб'ектыўнага пачатку, павышэння долі мастацкай умоўнасці, абстрагаванасці, разбурэння ўстойлівага сюжэта. Аналітычны падыход да рэчаіснасці абумовіў выбар адпаведнай мастацкай формы выражэння, найбольш блізкай светаадчуванню В. Казько, - інтэлектуалізаванай прозы, звернутай да духоўных каштоўнасцей у імя разумнасці быцця, «спакою завершанасці».

Названыя мастацкія асаблівасці, вылучаныя тэарэтычна, толькі ў асобных рысах характарызуюць уплыў «плыні свядомасці» на прозу В. Казько. У творах пісьменніка яны выяўляюцца, на першы погляд, у сумбурным, але разам з тым рупліва прадуманым, цэласным, непарыўным, дыялектычным асэнсаванні быцця.

Творы В. Казько добра вядомы 'ытачу. Знявечанае вайною дзяцінства, клопат аб прыродзе, недасканаласць этычных адносінаў у грамадстве - гэтыя тэмы прадвызначылі вышыню маральных крытэрыяў прозы В. Казько і, адпаведна, прыхільнасць шырокай чытацкай аўдыторыі. Разам з тым творчасць беларускага пісьменніка, дзякуючы сваёй шматаспектнасці, неардынарнасці, маральна-



Рэпазітарый БарДУ

этычнай і філасофскай заглыбленасці, суб'ектыўнасці, нават метафізічнай скіраванасці, па-ранейшаму застаецца новай старонкай у гісторыі нацыянальнай прозы, загадкавай планетай мастацкага быцця, дзе ёсць прастора для чытацкіх думак, пачуццяў, фантазій і ўяўленняў.

**Літаратура**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т.- Мінск: Беларус. навука, 2002.- Т. 4: кн. 1: 1966-1985 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. - С. 729-750.

2. Казько, В. Прахожы / В. Казько // Полымя. - 1995. - № 9. - С. 24-104.

3. Казько, В. Судны дзень: аповесці, апавяданні/ В. Казько. - Мінск: Мает, літ., 1998. - 478 с. - (Залатая серыя. Проза XX стагоддзя).

4. Літаратура народаў свету: XX стагоддзе: хрэстаматыя для 11 кл. / склад. Е. А. Лявонава, Л. П. Баршчэўскі. - Мінск: Рэд. часоп. «Крыніца», 1999. - 720 с.

*Смаль В. М. (Брэст, Беларусь)*

## ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТРАДЬЩЫЙ У СУЧАСНАЙ П'ЕСЕ ДЛЯ МОЛАДЗІ (на прыкладзе п'есы "Іван Світаннік" Галіны Каржанеўскай)

Драматычныя творы ў параўнанні з гіразаічнымі і паэтычнымі ў ідэйна-маральным выхаванні юнага пакалення маюць не меншы, а нярэдка і большы патэнцыял таму, што яны арыентаваны на яго сцэнічнае ажыццяўленне. Для чытача маладога веку гэта важна, бо пры выверанай архітэктоніцы п'есы, дакладна расстаўленых акцэнтах, дынаміцы, аўтарскіх рэмарках павышаецца ўзровень эмпатыі. Пры пастаноўцы ж п'ес на сцэне суперажыванне героям яшчэ большае, чым пры чытанні. У ацэнцы сілы эстэтычнага ўздзеяння драматычнага твора на рэцыпіента нельга не пагадзіцца з П. Васючэнкам: "Феномен драматургіі - стварэнне тэатральнай ілюзіі, падчас такой выразнай і пераканаўчай, што яна можа падацца больш рэальнай, чым само жыццё" [1,с. 6]. Менавіта гэтым тлумачыцца незвычайная папулярнасць драматургіі з часоў старажытнай Грэцыіі да нашых дзён. Магія тэатральнага відовішча зачароўвае гледача і дае пачуццё далучанасці да паказанага дзеяння - гэтым тлумачыцца канкурэнтаздольнасць драматургіі сярод такіх папулярных сёння тэлебачання і інтэрнэта.

У апошнія дзесяцігоддзі дзякуючы намаганням такіх мастакоў слова як А. Дудараў, П. Васючэнка, С. І^аваяёў, Г. Каржанеўская, 3. Дудзюк і іншых аўтараў, у параўнанні з папярэднімі перыядамі значна ўзрасла колькасць высокамастацкіх, маральна выверaных драматычных твораў для юнага пакалення. Аўтары п'ес, адрасаваных моладзі, у пераважнай большасці засталіся вернымі традыцыйнай драме, у той час як у "дарослай" драматургіі дамінавала эстэтыка бяссэнсіцы. Аднак па-ранейшаму адной з актуальных праблем драматургі з'яўляюцца "выбар героя, пошукі актуальнай тэматыкі і праблематыкі. Нярэдка сучасныя драматургі, як і іх папярэднікі, спыняюць свой выбар на фальклорных сюжэтах або сюжэтах, напісаных па матывах народных казак, таму герой малюецца ў адпаведнасці з традыцыямі вуснанароднага казачнага эпасу. У гэтым плане цікава паназіраць за галоўнымі героямі драматычных твораў са зборніка "Сінязорка", дзе большасць п'ес - казкі. Героі ўсіх п'ес арыентаваны найперш на прапаганду дабра, чалавечнасці і маральнасці.

Напрыклад, п'еса Галіны Каржанеўскай "Іван Світаннік" пабудавана па класічнай схеме народнай чарадзейнай казкі: пралог пачынаецца традыцыйным "жылі-былі" і адыгрывае ролю зачына, які ўводзіць рэцыпіента ў казачны свет, акрэслівае месца дзеяння і тлумачыць паходжанне імёнаў галоўных герояў: Світанніка, Вячорніка, Паўночніка. Пачатак першай карціны першай дзеі пачынаецца словамі аўтара, якія характарызуюць сям'ю галоўных герояў даволі станоўча. Тры браты вяртаюцца дадому надвячоркам, "здымаюць з плеч косы" - значыць увесь дзень яны правялі за працаю, "стомлена садзяцца - хто на прызбу, хто на кругляки" - відаць, працавалі не абы як. Гара насечаных дроў перад ганкам хаты гаворыць пра тое, што ў гэтай сям'і праца ў пашане. Аднак, першы ж дыялог выразна расстаўляе акцэнты ў характарыстыцы герояў. Паўночнік скардзіцца, што яму надакучыла працаваць: "То арэш, то сячэш, то косіш... Кожны дзень адно і тое ж" [2, с. 38]. Адказ Світанніка на словы брата характарызуе яго як аптыміста, рамантыка, які ўмее за цяжкай, нястомнай працай бачыць прыгажосць навакольнага асяроддзя і жыцця ў цэлым: "Ну і



Рэпазіторый БарГУ

***Истомин В. С*** ПОЛИТИЧЕСКИЙ ДИСКУРС В ХУДОЖЕСТВЕННОМ ПРОИЗВЕДЕНИИ ............... 86
***Кунгер Н. М.*** ВОБРАЗ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У АПОВЕСЦІ ВОЛЬГІ ІПАТАВАЙ "ПРАДЫСЛАВА" ............... 89
***Мельнікава А, М.*** ХРЫСЦІЯНСКІЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРАХ МАРЫИ ВАЙЦЯШОНАК ............... 91
***Пазняк И.*** М ГОРАД ЯК ТЭКСТ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ШТАРАТУРЫ ............... 93
***Петрушкевіч А. М.*** ДРАМАТЫЧНА АБВОСТРАНАЕ І ЭМАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫТАНЧАНАЕ ДЗЕЯННЕ Ў ЛІРЫЧНЫМ СЮЖЭЦЕ (паводле паэзіі Дануты Бічэль) ............... 95
***Пучынская Т.*** М МАСТАЦКІПРЫЁМ "ПЛЫНЬ СВЯДОМАСЦГ Ў ТВОРЧАСЩ В. КАЗЬКО ............... 99
***Смоль В, М.*** ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У СУЧАСНАЙ П'ЕСЕ ДЛЯ МОЛАДЗІ (на прыкладзе п'есы "Іван Світаннік" Галіны Каржанеўскай) ............... 101
***СнежкоЕ.В.*** СНОВИДЕНИЕ В КОМПОЗИЦИИ ПОВЕСТИ В.П.АКСЕНОВА «ЗАТОВАРЕННАЯ БОЧКОТАРА» ............... 103
***СузькоА.У.*** ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЯ АДМЕТНАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ АНТЫЎТОПІІ (паводле аповесці Ю. Станкевіча "Эрыніі") ............... 106
***Штэйнер /. Ф.*** МАДЭРНІЗАЦЫЯ ПРЫНЦЫПАЎ КЛАСІЧНАЙ ПАЭЗІІ: ГЕНЕЗІС, ЭВАЛЮЦЫЯ, ПЕРСПЕКТЫВЫ (беларуская паэзія і еўрапейскія традыцыі) ............... 109
***Ярыго Н. А.*** ЖАНРОВЫЕ ВАРИАЦИИ СОВРЕМЕННОГО РУССКОГО РОМАНА ............... 113

## МОВА І СТЫЛЬ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Ванькові А. В,*** МАЙСТЭРСТВА АНАТОЛЯ ГРАЧАНІКАВА-КАЗАЧНІКА (на аснове ЧКазкі пра Івана-ганчара і пачвару-цара") ............... 116
***Борсук Н. М.*** ХРАМ І АПІРЫШЧА ДУШЫ Ф. КАРПІНСКАГА ............... 118
***Вераксич И. Ю.*** К ВОПРОСУ ОБ ИСТОРИИ РАЗВИТИЯ КОМПАРАТИВИСТИКИ ІСАК НАУКИ ЗА РУБЕЖОМ ............... 121
***Кушнарова К. В.*** ЖАНРАВАЯ СПЕЦЫФ1КА ПРОЗЫ Л. РУБЛЕЎСКАЙ ............... 124
***Лиденкова О. А.*** ЭЛЕМЕНТЫ ЛАНДШАФТНОГО КОДА ЛИТЕРАТУРНОЙ БАЛЛАДЫ ............... 127
***Нуждзіна Т. С*** АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ - АЛЯКСАНДР ТВАРДОЎСКІ: КАНТАКТЫ, СУВЯЗІ Ў СВЯТЛЕ ЭПІСТАЛЯРНЫХ ЗВЕСТАК ............... 130
***Палукошка В. L*** «МИРОСЛАВ, КНЯЗЬ ДРЕГОВИЧСКИЙ» ЭДУАРДА СКОБЕЛЕВА: СПЕЦЫФІКА ЖАНРУ ............... 133
***Смоль В. М.*** КН1Г1 МІТРАФАНА ЗНОСКІ "ХРОНІКА АДНАГО ЖЫЦЦЯ" І ДАНУТЫ ВАШУКУЎНА-КАМЯНЕЦКАЙ "БРЭСТ - ГОРАД НЕЗАБЫВАЕМЫ' У КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ г. БРЭСТА МІЖВАЕННАГА ПЕРЫЯДУ ............... 135
***Соколова В. Ф.*** СТИЛИСТИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ ТВОРЧЕСТВА П. И. МЕЛЬНИКОВА-ПЕЧЕРСКОГО (дилогия «В лесах» и «На горах») ............... 137
***Торкан И. Е.*** ПРОСТРАНСТВО КАК ФОРМА КОНСТРУИРОВАНИЯ МИРА В ПОЭЗИИ О. МАНДЕЛЬШТАМА ............... 140
***Шамякіна С В.*** РЭЧЫЎНЫЯ ВОБРАЗЫ І ВОБРАЗЫ-ТРОПЫ: СЭНСАВА-СТРУКТУРНАЕ СУПАСТАЎЛЕННЕ ............... 143
***Шаучэнка В.*** Я., ***Шаучэнко М. М.*** ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ - АРЫЕНЦІР РАЗВІЦЦЯ ІХ РАЗУМОВЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ............... 146

## АКТУАЛЬНЫЙ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

***Антонова Е. А,*** О НЕКТОРЫХ ОСОБЕННОСТЯХ ИЗУЧЕНИЯ ОДНОСОСТАВНЫХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ ............... 149
***Ахраменко П. Е.*** БЕЗЛИЧНЫЕ ПРЕДЛОЖЕНИЯ В ЯЗЫКОВОЙ КАРТИНЕ МИРА (на материале оригинала и перевода произведений И. П. Шамякина) ............... 151
***Барысенка Н. А., Гуцава В. Л.*** УСТАРЭЛЫЯ АСАБОВЫЯ НАМІНАЦЫІ Ў АПАВЯДАННІ ВОЛЬП ІПАТАВАЙ "ГАЙНА І МІКАШ" ............... 153
***БяляеваГ.М.*** АНТРАПОНІМЫ Ў ТРЫЛОГИ І. НАВУМЕНКІ "САСНА ПРЫ ДАРОЗЕ", "ВЕЦЕР У СОСНАХ", "СОРАК ТРЭЦГ" ............... 155
***Бойка В. Ю.*** ЭМАЦЫЯНАЛЬНА-ЭКСПРЭСІЎНАЯ ЛЕКСІКА СА ЗНАЧЭННЕМ ПСІХІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ У ТЭКСТАХ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ БЛОГАЎ ............... 158
***Гераськіна Т. А.*** АДДЗЕЕПРЫМЕТНІКАВЫЯ ЎТВАРЭННІ Ў ТВОРАХ І. П. ШАМЯКІНА ............... 159

Репозиторий БарГУ